# АДЗІНСТВА МЕНТАЛІТЭТУ, САМАСВЯДОМАСЦІ І КУЛЬТУРЫ НАЦЫІ

***А. І. Марэцкі,***
*дэкан факультэта завочнага навучання*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*

Нацыя – прадукт працяглага гістарычнага развіцця. Яна, як вядома, мае свае падставы, вытокі, умовы ўзнікнення і развіцця, сваю гісторыю і, зразумела, не толькі сваё мінулае і сучаснае, але і будучыню, характарызуецца наступнымі сацыяльна-псіхалагічнымі і сацыяльнымі якасцямі:

1) унікальным псіхалагічным складам, своеасаблівым стылем, вобразам мыслення, пачуццёва-эмацыянальным светаўспрыманнем, менталітэтам;

2) адзінай самасвядомасцю, ядром якой з’яўляецца самаідэнтыфікацыя;

3) роднай мовай, яе лексікай, стылем і іншымі спецыфічнымі сродкамі вызначэння нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці;

4) самабытнай матэрыяльнай і духоўнай культурай, у якой адбываецца самарэалізацыя «душы» нацыі як унікальнай духоўнай скарбніцы;

5) агульнымі этнічнымі каранямі – маці-зямля, бацькаўшчына, радзіма;

6) нацыянальнай дзяржаўнасцю (нацыя – гэта народ, арганізаваны ў дзяржаву).

Узнікненне і развіццё нацыі складаецца з двух узаемадзеючых працэсаў: фарміравання і развіцця агульначалавечых, відавых асаблівасцей і адначасова ўнікальных і непаўторных асаблівасцей, якія абумоўліваюць нацыянальныя рысы сацыяльнай супольнасці. Чалавек на ўсе часы застанецца мерай усіх рэчаў, сутнасцю якога з’яўляецца своеасаблівае спалучэнне ўсеагульных, агульных і адзінкавых, ці, інакш кажучы, відавых, этнанацыянальных і ўнікальных асобасных якасцей. Нацыя – гэта калыханка асобы, гэта самае каштоўнае на свеце, што можа быць у асобы. Крыніца быцця нацыі – нацыянальная культура, адукацыя, выхаванне. Гарантам быцця нацыі, ажыццяўленнем нацыянальных інтарэсаў з’яўляецца дзяржава. Толькі пры наяўнасці трох падстаў – уласнай нацыянальнай «душы», нацыянальнай культуры і нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржавы народ мае гарантаваную і вартую годнасці будучыню. Сэнс і прызначэнне нацыі выяўляецца ў ажыццяўленні натуральна-арганічнага росквіту сваіх духоўных і сацыякультурных магчымасцей, таго ўнікальнага, што ў яе ёсць. Як росквіт нацыі немагчымы без росквіту кожнага яе індывіда, так і росквіт чалавецтва магчымы толькі на падставе росквіту кожнай нацыі, кожнага этнасу.

Фарміраванне і развіццё нацыі – гэта ў першую чаргу працэс станаўлення і развіцця яе духоўнага складу – псіхічных якасцей, менталітэту, самасвядомасці і нацыянальнай свядомасці, нацыянальнай ідэі і нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі.

Нацыянальнасць чалавека вызначаецца яго прыналежнасцю да той ці іншай культуры – традыцый, звычаяў, мовы. Дасягненні кожнага народа маюць пэўную каштоўнасць для асобнага яго прадстаўніка, таму што складаюць яго нацыянальную гордасць. Для захавання сваёй нацыянальнай культуры ў аддаленых ад гістарычных месцаў пражывання той ці іншай нацыі сталі стварацца аб'яднанні па тыпе нацыянальных абшчын. Абшчына як самакіруемая арганізацыя садзейнічае выпрацоўцы пэўных поглядаў, форм уздзеяння на падрастаючае пакаленне, фарміруе такую якасць асобы, як талерантнасць.

Існуе некалькі падыходаў да вызначэння «талерантнасці» (Д. Зіноўеў, У. Лектарскі, Т. Поштарава): як сіноніма «цярпімасці», як уласцівасці ці якасці, магчымасці што ці каго-небудзь цярпець толькі па «міласэрнасці» [1], як актыўнай маральнай пазіцыі і псіхалагічнай гатоўнасці да цярпімасці для пазітыўнага ўзаемадзеяння з людзьмі іншай культуры, нацыі, рэлігіі, сацыяльнага асяроддзя і інш.

Аўтары звязваюць талерантнасць і ўстойлівасць асобы. Устойлівасць з'яўляецца адным з крытэрыяў талерантнасці. Так, А. Пагодзіна паказчыкамі ўстойлівасці называе эмацыянальную стабільнасць, ветлівасць, цярпенне, сацыяльную адказнасць, самастойнасць, сацыяльную рэлаксацыю [3].

Менталітэт нацыі – гэта гістарычна сфарміраваны своеасаблівы вобраз мыслення, спосаб і стыль светаадчування, светаўспрымання і светаразумення, якія абумоўліваюць пачуццёва-эмацыянальныя і светапоглядныя адносіны да навакольнага свету, да сябе і свайго месца ў грамадстве і сусвеце.

Ментальнасць нацыі, як і кожнай асобы, мае два ўзроўні – бессвядомы, глыбінны, які сваімі каранямі ўваходзіць у рода-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

племянны генафонд, і свядомы, ядром якога з'яўляецца асэнсаванне ўласнага менталітэту, асобнасці і ўнікальнасці штодзённага жыцця, якое ўключана ў агульны гістарычны працэс. На падставе менталітэту нацыі фарміруецца ўвесь складаны і шматразнастайны яе духоўны свет і кожнага яе індывіда. Менавіта тая сістэма архетыпаў нацыянальнай свядомасці, якая ўтварылася на пачатковых ступенях станаўлення нацыі, і складае яе «код», які накіроўвае далейшы нацыянальна-духоўны, нацыянальна-культурны працэс. Менталітэт, такім чынам, нацыя памяняць не можа, пакуль яна застаецца менавіта гэтай нацыяй. Менталітэт нацыі, як і яе геапалітычнае прызначэнне, мае карані ў зыходных геаграфічных, біяэтнічных і сацыяэтнічных перадумовах яе ўзнікнення.

Менталітэт нацыі заўсёды выступае як унікальны спосаб асэнсавання прыроднага і сацыяльнага быцця. Менавіта таму ён заўсёды характарызуецца пэўнай накіраванасцю, вызначэннем мэт, фарміраваннем ведаў і каштоўнасцей, норм жыцця, вобразаў будучыні. І гэта заканамерна, бо светаадчуванне і светаразуменне грунтуюцца на пачуццях і эмоцыях, якія больш ці менш непасрэдна звязаны з біясацыяльнымі патрэбамі і нацыянальнымі інтарэсамі супольнасці і індывідаў. Зразумела, што ўсё гэта не можа не ствараць пэўную калектыўную настроенасць, якая трансфармуецца ў адпаведныя матывы і мэты дзейнасці. Менталітэт, як своеасаблівы і непаўторны спосаб мыслення, адчування, светаўспрымання і эмацыянальна-інтэлектуальнага рэагавання, увасабляецца найярчэй усяго ў такіх элементах нацыянальнай культуры, як мова, фальклор, музыка, спевы, танец, стыль працы, культавых абрадаў і інш. На іх падставе фарміруецца будынак нацыянальнай культуры. Таму кожны з нас пры ўспрыманні гэтых відаў народнай творчасці беспамылкова вызначае іх нацыянальную прыналежнасць. Пры гэтым менавіта мова з'яўляецца першай і асноўнай формай матэрыялізацыі менталітэту, мова звязвае індывідаў. Усе прадстаўнікі дадзенай нацыі добра разумеюць адзін аднаго. Па словах Д. Аўсяніка-Кулікоўскага: «Если вы хотите почувствовать своеобразную психику данной национальности, изучите язык ее, как в ее повседневной функции («живую речь»), так и в его литературном выражении» [2]. Менавіта яна адыгрывае ў культуры сістэмавызначальную ролю. А паколькі мова захоўвае ў сабе ўсеагульныя сэнсы і значэнні – усю тую інфармацыю, якая здабыта народам на працягу гісторыі, то толькі яна дазваляе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«раскадзіраваць» якасці нацыянальнай душы і атрымаць ключ да адэкватнага яе ўспрымання.

Праблема менталітэту непасрэдна звязана з нацыянальнай свядомасцю і самасвядомасцю. «Самосознание – сознание человеком своих действий, чувств, мыслей, мотивов поведения, интересов, своего положения в обществе».

Значыць, нацыянальная свядомасць уключае:

1) веды аб сваім менталітэце, аб сваім унікальным і непаўторным духоўным абліччы ў параўнанні з іншымі народамі і этнічнымі супольнасцямі;

2) самаўсведамленне аб той сістэме аднолькавых сацыяльных і нацыянальна-псіхалагічных якасцей, што ўласцівы кожнаму індывіду, кожнай асобе, якія і дазваляюць ідэнтыфікаваць іх як нацыянальную супольнасць;

3) сістэму поглядаў і ўяўленняў аб сваім месцапрызначэнні ў агульначалавечай супольнасці, наогул у свеце.

Іншымі словамі, нацыянальная самасвядомасць – гэта цэласны духоўны свет, у якім ёсць уяўленне карэнных нацыянальных інтарэсаў, ідэалаў аб уласнай нацыі як суб'екце гістарычнага працэсу, аб прынцыпах арганізацыі свайго жыцця і адносінах да ўсіх іншых нацый. Канешне, самасвядомасць уключае пэўнае разуменне адзінства нацыянальнай мовы, нацыянальнага характару, культуры, тэрыторыі, дзяржаўнасці, пачуцця нацыянальнай годнасці. Нацыянальная свядомасць складаецца з маральна-рэлігійных, палітыка-прававых, эканамічных, мастацка-эстэтычных, нацыянальна-этнічных і іншых поглядаў і каштоўнасцей.

Такім чынам, нацыянальная свядомасць узнімаецца да светапогляднага філасофскага, навукова-тэарэтычнага ўзроўню, што, у сваю чаргу, стварае падставу вызначэння чарговай, вышэйшай ступені самасвядомасці нацыі – нацыянальнай ідэі. Яна ўзнікае і фарміруецца заканамерна, як заканамерна ў сучасных умовах праектаванне народам сваёй будучыні на падставе вызначэння і навуковага асэнсавання ім сваіх інтарэсаў. Таму на сучасным этапе з'яўляецца заканамерным праектаванне народам сваёй будучыні на падставе вызначэння і навуковага асэнсавання ім сваіх доўгатэрміновых стратэгічных інтарэсаў. Таксама заканамерна, што на сучасным этапе нашага гістарычнага развіцця эвалюцыя нацыянальнай свядомасці трансфармуецца ў нацыянальную ідэю і дзяржаўную ідэалогію. І гэта зразумела, таму што адзіным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гарантам нашага быцця, нашай нацыянальнай самабытнасці і палітычнай незалежнасці з’яўляецца дзяржава.

---

*1. Даль, В. И.* Толковый словарь живого великорусского языка : в 4 т. / В. И. Даль. – М. : Прогресс : Универс, 1994. – Т. 2 : И–О.

*2. Овсянико-Куликовский, Д. Н.* Психология национальности / Д. Н. Овсянико-Куликовский. – Пг. : Время, 1922. – С. 23.

*3. Погодина, А. А.* Толерантность : термин, позиция, смысл, программа / А. А. Погодина // История. – 2002. – № 11. – С. 24–29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ